*С.В.ЗЫГМАНТОВІЧ*

# РОЛЯ БІБЛІЯТЭЧНЫХ КАДРАЎ У ЗАХАВАННІ І РАСПАЎСЮДЖВАННІ КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

*Разглядаюцца пытанні трансфармацыі функцый бібліятэк у новых сацыяльна-эканамічных і тэхналагічных умовах, узрастання ролі і спецыфікі дзейнасці бібліятэчных кадраў у рэалізацыі культуразберагальнай і культурафарміруючай функцый бібліятэкі на сучасным этапе.*

У кожным грамадстве ствараюцца свае ўмовы існавання палітычных, грамадскіх і культурных арганізацый, якія спрыяюць іх развіццю, уздыму або заняпаду. Крызіс той ці іншай з'явы, па сутнасці, праяўляецца ў тым, што новыя каштоўнасці і новыя формы арганізацыі жыцця змяняюць старыя. Яшчэ і сёння існуюць меркаванні аб тым, што традыцыйная бібліятэка зжывае сябе, што яна часткова страціла сваё сапраўднае прызначэнне і ўжо не задавальняе тым патрабаванням, якія да яе прад'яўляе сучаснае грамадства, і таму яе хутка выцісне "віртуальная бібліятэка". Ці вытрымае бібліятэка моцны націск выданняў у лічбавай форме і ўсеагульнага доступу да такіх матэрыялаў? Вастрыня канфлікту, па меркаваннях экспертаў, пакуль што падтрымліваецца стэрэатыпнымі ўяўленнямі аб бібліятэцы як застылай форме, аб электроннай інфармацыі як дынамічнай будучыні.

Разам з тым вопыт рэальнага ўдзелу бібліятэкі ў сучасных інфармацыйных тэхналогіях сведчыць, што істотна змяняюцца і будуць змяняцца элементы, якія бібліятэка ўключае ў працэс інфарматызацыі, а таксама пра карыснасць прафесійна-асобасных якасцей бібліятэкараў у сферы інфармацыі, якая становіцца лічбавай. М.Браўн адзначае, што ніхто так добра, як бібліятэкары, не разумее розніцы паміж інфармацыяй і ведамі. Валодаючы гэтым разуменнем і набываючы новыя тэхнічныя (тэхналагічныя) навыкі, бібліятэкары здольны ўзначаліць працэс стварэння "інтэлектуальных прадпрыемстваў" [1, с. 229].

Бібліятэка са старажытных часоў ажыццяўляе функцыі сацыяльнай памяці чалавецтва, збіраючы, акумуліруючы, захоўваючы і прадастаўляючы неабходную інфармацыю і дакументы, якія яе змяшчаюць. М.Я.Дворкіна падкрэслівае, што з'яўленне бібліятэк было ў гісторыі важнай інавацыяй. З цягам часу бібліятэка як сацыякультурны інстытут стала традыцыяй, якую грамадства захоўвала з веку ў век [3, с. 94]. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі дазваляюць бібліятэцы больш поўна рэалізоўваць функцыю сацыяльнай, культурнай памяці.

Амерыканскія бібліятэказнаўцы любяць гаварыць, што бібліятэкі павінны адказваць на выклік часу. Такім чынам яны фармулююць думку пра неабходнасць адпаведнасці бібліятэчнай палітыкі, прафесійнага ўзроўню бібліятэкараў зменлівым умовам рэчаіснасці.

Алічбоўка фондаў, стварэнне электронных калекцый, рэтраканверсія фондаў і каталогаў сталі сучаснымі напрамкамі дзейнасці бібліятэк. Бібліятэкі сёння ставяць перад сабой задачу не толькі захавання з дапамогай лічбавых тэхналогій культурнай спадчыны шляхам пераводу на электронныя носьбіты рэдкіх выданняў, найбольш актыўнай часткі фондаў, каталагізацыі дакументаў у электроннай форме, стварэння паўнатэкставых баз даных, але і захавання лічбавай культурнай спадчыны.

Сёння рост інфармацыйных рэсурсаў, якія ствараюцца, распаўсюджваюцца, становяцца даступнымі карыстальнікам і захоўваюцца ў лічбавай форме, значна апярэджвае рост дакументальных крыніц. Яны часта недаўгавечныя, хаця многія з гэтых рэсурсаў маюць сталую культурную, навуковую каштоўнасць і таму ўяўляюць сабой спадчыну, якую неабходна захоўваць для сучаснікаў і нашчадкаў. Бясспрэчна, што доступ да інфармацыі стварае больш шырокія магчымасці для творчых зносін, абмену ведамі і іх сумеснага выкарыстання ўсімі народамі. Бібліятэкі ўключаюцца ў гэтую работу шляхам каталагізацыі рэсурсаў побач з дзейнасцю па захаванні нацыянальных друкаваных крыніц, стварэнні фондаў, архіваў, калекцый нацыянальных электронных рэсурсаў і г.д. Яны бяруць удзел у рэалізацыі сусветнай праграмы "Памяць свету", нацыянальнай праграмы "Памяць Беларусі", накіраваных на забеспячэнне захаванасці і агульнадаступнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сусветнай і нацыянальнай дакументальнай спадчыны, а таксама вызначаюць і бачаць сваю ролю ў захаванні лічбавай культурнай спадчыны [3, с. 13].

Бібліятэкі з'яўляюцца не толькі захавальнікамі культурных здабыткаў, яны забяспечваюць самым шырокім колам насельніцтва доступ да назапашанага інтэлектуальнага, культурнага багацця грамадства. Бібліятэкі ажыццяўляюць камунікацыю, перадачу культурных каштоўнасцей, друкаванай прадукцыі ад пакалення да пакалення. Сёння яны найбольш запатрабаваныя, таму што з'яўляюцца самымі даступнымі, яны хутка змаглі інтэграваць у сваю працу традыцыйныя і электронныя тэхналогіі і рэсурсы, не страціўшы і не змяніўшы галоўных патрабаванняў і задач сваёй дзейнасці, а, наадварот, узбагаціўшы іх новымі падыходамі. На базе бібліятэк адкрываюцца цэнтры прававой інфармацыі, цэнтры дзелавой, экалагічнай інфармацыі, цэнтры (класы) інтэрнет-рэсурсаў і інш., якія дазваляюць атрымаць не проста доступ да інфармацыі (як, напрыклад, інтэрнет-кафе), а доступ да інфармацыі пэўнага зместу, самага шырокага спектра па відавым, жанравым складзе, праблематыцы, па форме прадастаўлення інфармацыі з улікам запатрабаванняў і чаканняў карыстальнікаў у выглядзе тэматычных баз даных, дайджэстаў літаратуры, аглядаў, фактаграфічных дасье, метаданых, кансультацый і г.д. Таму нельга не пагадзіцца з думкай дырэктара Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі В.Фёдарава аб тым, што многія праблемы адукацыі, культуры, навукі, інфармацыі невырашальныя без прыцягнення такога важнага інстытута, як бібліятэка, безумоўна, калі пад ёй разумець не суму ўстаноў саміх па сабе, а засяроджанне нацыянальнай памяці, якая прымнажалася вякамі, сістэматызаваныя і падрыхтаваныя для выкарыстання веды [4, с. 5].

Сёння, калі ў навуковай сферы выдзяляюцца два падыходы да перспектыў развіцця бібліятэкі – гуманітарны і тэхнакратычны, нельга забываць, што для бібліятэкі як культурнага, духоўнага, цывілізацыйнага феномена застаюцца непахіснымі: арыентацыя на чалавека; чытач – цэнтральная фігура ў бібліятэцы; першапачатковае значэнне гуманітарнай састаўной часткі бібліятэчнай дзейнасці; тэхніка і тэхналогія – сродкі ўдасканалення бібліятэчнага абслугоўвання пры ўмове іх кваліфікаванага і дыферэнцыраванага выкарыстання. Інфарматызацыя і тэхнічны прагрэс самі па сабе не з'яўляюцца супермэтай грамадства, яны павінны разглядацца як магутны сродак яго інтэлектуалізацыі, перадумова пашырэння культурна-інфармацыйных магчымасцей кожнага суб'екта, у тым ліку і бібліятэкі.

Менавіта бібліятэкі маюць унікальную магчымасць спалучаць у сваёй працы друкаваныя і электронныя сродкі. Друкаванае слова валодае важнымі спецыфічнымі магчымасцямі ўздзеяння на чытача: выхоўвае любоў да роднай мовы, фарміруе інтэлект, актывізуе думку, выклікае пачуццё суперажывання, развівае мову, павышае пісьменнасць, развівае ўяўленне і г.д. Электронныя сродкі маюць свае перавагі (мабільнасць, высокатыражнасць, здольнасць пранікаць у кожны дом, аператыўнасць інфармавання, вобразная выразнасць і г.д.), тым не менш у іх няма тых якасцей, якімі валодае слова друкаванае. Толькі ўзаемна дапаўняючы адно аднаго, яны могуць утварыць камфортнае для чалавека культурна-інфармацыйнае асяроддзе. Але заўважым, што дзейнасць электронных сродкаў інфармацыі, асабліва тэлебачання, Інтэрнета, ва ўмовах недастатковага прававога рэгулявання і таму нярэдка неабмежаванай свабоды ад высокіх і проста нармальных чалавечых эстэтычных і маральных крытэрыяў і ўзвышэння законаў рынку можа набываць схільнасць да маніпуліравання свядомасцю, прыніжэння высокага і ўзвышэння нізкага, блытаніны дабра і зла, добрага і дрэннага.

Для бібліятэкараў жа ва ўсе часы вельмі значнымі былі светапоглядныя пазіцыі. У прафесійным плане гэта комплекс установак, поглядаў на культурныя каштоўнасці, пазіцыя ў іх адборы і ацэнцы па пэўных крытэрыях. Вышэйшым прынцыпам, якім кіруецца ў сваёй дзейнасці бібліятэкар-бібліёграф, выступае прынцып супастаўлення (суадносін) культуры і антыкультуры. У сувязі з гэтым у дзейнасці бібліятэкара-бібліёграфа вылучаецца арыентуючая функцыя ў свеце дакументна фіксаваных ведаў. Бібліятэка праводзіць адбор крыніц інфармацыі, дае ім характарыстыку і рэкамендацыю ў адпаведнасці з каштоўнасцю і патрэбнасцямі розных катэгорый карыстальнікаў. Свабоднае развіццё і максімальна поўнае задавальненне патрэбнасцей грамадства ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі і дакументах, захаванне і прапаганда каштоўнасцей культуры – менавіта гэта вызначае сапраўды гуманістычную накіраванасць развіцця бібліятэк.

У новых інфармацыйных умовах патрабаванні да такіх прафесійных якасцей бібліятэкараў-бібліёграфаў, як уменне правяраць інфармацыю на рэлевантнасць і пертынентнасць, ацэньваць якасць, дакладнасць і навізну прадастаўляемай інфармацыі, аддзяляць залішнюю інфармацыю, значна ўзрастаюць, што знаходзіць сваё адлюстраванне ў нарматыўных дакументах, рэгламентуючых бібліятэчную дзейнасць; патрабаванні да прафесіі і прафесійных якасцей бібліятэкараў вызначаюцца ў дакументах грамадскіх прафесійных арганізацый розных краін.

У сучасных умовах побач з пашырэннем даступнасці інфармацыі адбыліся змены і ў традыцыйнай расстаноўцы фігур на полі бібліятэчнай дзейнасці (бібліятэкар – чытач). Сёння бібліятэкар не абавязаны прасоўваць пэўнае абавязковае кола крыніц, а карыстальнік не вымушаны абмяжоўвацца ў сваіх інфармацыйных патрабаваннях. На гэтым шляху актыўнага далучэння карыстальнікаў да інтэлектуальнага і духоўнага патэнцыялу бібліятэк значная роля належыць асваенню бібліятэчнымі кадрамі інтэрнэт-тэхналогій.

Бібліятэкі пачалі актыўна працаваць з Інтэрнетам з моманту яго ўзнікнення шляхам прадастаўлення сваіх інфармацыйных рэсурсаў і інфармацыйных рэсурсаў іншых бібліятэк і арганізацый. Сёння дапамогу карыстальнікам не толькі ў атрыманні бясплатнага доступу да Інтэрнета, але і ў пошуку неабходнай інфармацыі, выкарыстанні ўсіх сервісных магчымасцей Інтэрнета ўзялі на сябе бібліятэкары праз арганізацыю спецыяльных навігатараў па рэсурсах Інтэрнета. Гэта кансультацыйная дапамога, прада-стаўленне доступу да камерцыйных, ліцэнзаваных інтэрнэт-рэсурсаў, электронная дастаўка дакументаў, нарэшце, мэтанакіраваная работа па фарміраванні камп’ютэрнай пісьменнасці карыстальнікаў. Больш таго, бібліятэкары сёння маюць магчымасць супрацоўнічаць з карыстальнікамі, якія знаходзяцца на адлегласці, праз арганізацыю службаў віртуальнага даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання, службаў тыпу “Запытай у бібліятэкара, спецыяліста…”. У новых тэхналагічных умовах бібліятэкары бес-перапынна ўдасканальваюць свае традыцыйныя ролі кансультанта, аналітыка, дарадчыка.

Вынікі сацыялагічных даследаванняў па пытанні “Чытач і Інтэрнэт” сведчаць, што больш паловы студэнтаў, аспірантаў (самыя актыўныя карыстальнікі Інтэрнета) у сваёй вучэбнай і навуковай дзейнасці не могуць абысціся без прамога кантакту з бібліятэкарам. Такі немалаважны паказчык, як наведвальнасць бібліятэк, у сувязі з камп’ютэрызацыяй не зніжаецца, а ўзрастае [5, с. 39]. На пытанне: “Ці захаваецца бібліятэка ў інфармацыйным грамадстве?” – 77% студэнтаў і 88% аспірантаў адказалі сцвярджальна [5, с. 40].

Бібліятэкі ўлічваюць тэндэнцыі, з’явы, якія адбываюцца ў сацыякультурным жыцці краіны: змены ў сацыяльным складзе насельніцтва, пражыванне на пэўнай тэрыторыі прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, міграцыя насельніцтва.

Усё гэта абумоўлівае розныя патрэбнасці ў інфармацыі, дакументах. Сёння бібліятэкі бяруць на сябе вельмі важную місію: яны дапамагаюць людзям адаптавацца ў незнаёмым для іх асяроддзі, атрымаць гісторыка-культурную інфармацыю, дапамагаюць падтрымліваць сувязі з роднай культурай; праз стварэнне залаў нямецкай літаратуры, амерыканскіх інфармацыйных куткоў, залаў франка-беларускай дружбы і іншых садзейні-чаюць знаёмству суайчыннікаў з культурай іншых народаў.

Адным з вядучых напрамкаў дзейнасці бібліятэк у апошнія гады стала краязнаўчая работа, у якой відавочны наступныя аспекты: адукацыйны (паглыбленне ведаў аб культуры і гістарычных каранях малой радзімы); маральна-выхаваўчы (павага да нацыянальных традыцый і звычак мясцовых жыхароў); інфармацыйна-дзелавы (садзейнічанне актывізацыі выкарыстання мясцовых рэсурсаў). Назіраецца як агульны аб’ём краязнаўчай работы, так і аднаўленне яе метадаў, кірункаў, формаў. Сярод краязнаў-чых інавацый можна назваць выданне рэгіянальных энцыклапедый, даведнікаў, хронік культурнага жыцця рэгіёнаў; захоўванне не толькі друкаваных мясцовых матэрыялаў, але і рукапісных; напісанне гісторыі населеных пунктаў, бібліятэк; падрыхтоўка як бібліяграфічных, так і фактаграфічных даведнікаў; змяненне тэхналогіі краязнаўчай работы – стварэнне краязнаўчых электронных каталогаў і баз даных, бібліяграфічных дапаможнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Неабходна адзначыць таксама немалаважную з’яву – гэта асваенне бібліятэчнай службай дзейнасці па прадастаўленні магчымасці атрымаць пэўную дадатковую адукацыю, магчымасці цікавага і карыснага правядзення вольнага часу. Праз арганізацыю гурткоў, аматарскіх аб’яднанняў бібліятэкі прылучаюць розныя катэгорыі насельніцтва да культуратворчай дзейнасці, праз арганізацыю творчых сустрэч з пісьменнікамі, мастакамі, акцёрамі, рэжысёрамі і іншымі садзейнічаюць прапагандзе лепшых узораў мастацтва і ўзбагачэнню духоўнага свету суайчыннікаў.

Мяняюцца стылістыка бібліятэчнай дзейнасці, яе імідж. Адыход ад вобраза бібліятэкі як казённай установы, бібліятэкі як храма з яго дыстанцыраванасцю ад карыстальнікаў, канструяванне вобраза ўтульнага дома адпавядаюць нацыянальным архетыпам славян і фарміруюцца ў масавай свядомасці з дапамогай розных сродкаў, у тым ліку з афармлення інтэр’ера і рэкламы. У сацыяльнай псіхалогіі гэты метад называецца тэхналогіяй культурнага аналага (С.Ю.Сцяпанаў), якая базіруецца на нацыянальных архетыпах. Краязнаўчыя куткі, міні-музеі, афармленне бібліятэкі з выкарыстаннем нацыянальнага каларыту, сродкаў нацыянальнай аўтэнтычнай культуры асацыіруюцца ў наведвальнікаў бібліятэкі з чымсьці родным, блізкім, уласнымі каранямі і выступаюць як важны элемент генетычнай памяці, як культурны код.

Такім чынам, інавацыйная дзейнасць бібліятэчных спецыялістаў абумоўлена фарміраваннем бібліятэкі новага тыпу, развіццём бібліятэкі як суб’екта, падсістэмы культуры, што пастаянна трансфармуецца, уключае ў сферу сваёй дзейнасці новыя дасягненні культуры і цывілізацыі. Валодаючы новымі тэхналогіямі, формамі арганізацыі ведаў і інфармацыі, бібліятэкары становяцца ўсё больш неабходнымі грамадству і карыстальніку і маюць свае задачы і мэты ў складаным працэсе вытворчасці, захоўвання, распаўсюджвання і засваення культурных каштоўнасцей як у традыцыйнай дакументна фіксаванай, так і электроннай форме.

---


*1. Арганізацыя* бібліятэчнага абслугоўвання нацыянальных меншасцей насельніцтва Беларусі: метадычныя парады / Нац. б-ка Беларусі; склад. Т.У.Котава, Г.К.Кулага. – Мн., 1993. – 24 с.

*2. Бібліятэка* – асяродак нацыянальнай культуры: па матэрыялах конкурсу / Нац. б-ка Беларусі; склад. Н.М.Касілава. – Мн., 2004. – 36 с.

*3. Дворкина, М.Я.* Библиотека как традиция и библиотечные традиции / М.Я.Дворкина // Библиотековедение. – 2000. – № 6. – С. 94.

*4. Кірухіна, Л.Г.* Публічныя бібліятэкі ў кантэксце культурнай разнастайнасці / Л.Г.Кірухіна // Бібліятэкі і міжкультурны дыялог: матэрыялы круглага стала (Мінск, 21 мая 2004 г.) / Цэнтр. б-ка імя Я.Купалы г. Мінска; склад. Т.В.Тарнагурская. – Мн., 2004. – С. 22–27.

*5. Кірухіна, Л.Г.* Самабытная спадчына нацыі: публічная бібліятэка як захавальніца народных традыцый: тэарэтыка-метадычны аспект / Л.Г.Кірухіна; Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2005. – 75 с.

*6. Кожевникова, Е.С.* Читатель и Интернет (по итогам исследования) / Е.С. Кожевникова // Библиотековедение. – 2005. – № 2. – С. 35–41.

*7. Российское* библиотековедение: XX век. Направления развития, проблемы и итоги: опыт монографического исследования / Рос. гос. б-ка. – М.: ФАИР-ПРЕСС: Пашков дом, 2003. – 432 с.

*8. Памяць* Беларусі на 2007–2010 гады: дзяржаўная праграма: праект / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2007. – 43 с.

*9. Публичные* библиотеки в век цифровой информации. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 2004. – 416 с.

*10. Рошчына, Т.І.* Памяць Беларусі: вынікі, праблемы і перспектывы даследавання кніжнай спадчыны / Т.І.Рошчына // Навукова-даследчая дзейнасць Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на мяжы стагоддзяў: зб. навук. прац. – Мн.: Красіка-Прынт, 2002. – С. 28–39.

*11. Рошчына, Т.І.* Нацыянальны фонд кніжных помнікаў Беларусі ў адзінай інфармацыйнай і культурнай прасторы / Т.І.Рошчына // Матэрыялы III Міжнародных


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кнігазнаўчых чытанняў “Кніга Беларусі: повязь часоў” / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2003. – С. 15–21.

*12. Рошчына, Т.І.* Памяць Беларусі “RADZIVILIANA” / Т.І.Рошчына // Бібліятэчны свет. – 2002. – № 3. – С. 3–10.

*13. Фёдоров, В.В.* Цифровые технологии в сохранении культурного наследия / В.В.Фёдоров // Библиотековедение. – 2004. – № 6. – С. 12–14.

*14. Фёдоров, В.* “И свеча бы не угасла…”: к читателям журнала “Библиотековедение” / В.Фёдоров // Библиотековедение. – 1999. – № 1. – С. 4–7.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ